Дзяржаўная ўстанова "Цэнтралізаваная сістэма дзяржаўных публічных бібліятэк г.Мінска"



# КАРАНІ

## КРАЯЗНАЎЧЫ ПРАЕКТ

ДА ГОДА МАЛОЙ РАДЗІМЫ

У кожнага чалавека ёсць на зямлі месца, дзе ён з'явіўся на свет, убачыў хараство роднай прыроды, пазнаў радасць і прыгажосць жыцця. І дзе б ён потым ні быў, куды б ні закінуў яго лёс – заўсёды з цеплынёй будзе ўспамінаць родныя мясціны, сваю малую радзіму. У многіх не знікае з часам жаданне пабываць там, зрабіць для яе штосьці карыснае, добрае. І ніколі не сціхае цікавасць да гісторыі краю, жаданне пазнаць новае, раскрыць нязведаныя старонкі мінулага, даведацца больш аб жыцці і дзейнасці знакамітых асоб, якія пакінулі след у гісторыі краіны.

## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

Арганізатарам праекта з'яўляецца дзяржаўная ўстанова "Цэнтралізаваная сістэма дзяржаўных публічных бібліятэк г.Мінска".

Праект рэалізуецца ў межах Года малой радзімы з мая па лістапад 2020 г.

## МЭТЫ І ЗАДАЧЫ ПРАЕКТА

- стварэнне інфармацыйнага віртуальнага рэсурсу;
- знаёмства ўсіх зацікаўленых з унікальнай спадчынай і традыцыямі розных рэгіёнаў Беларусі;
- падтрымка творчых ініцыятыў;
- спрыянне развіццю інфармацыйнай культуры ўдзельнікаў праекта;
- выкарыстанне новых бібліятэчных форм і метадаў работы, сучасных інфармацыйных тэхналогій па распаўсюджванні і папулярызацыі ведаў аб краі.

## ПАТРАБАВАННІ ДА ЎДЗЕЛЬНІКАЎ ПРАЕКТА

Работы прымаюцца да 1 верасня 2020 года як ад асобных удзельнікаў, так і ад аўтарскіх калектываў. Удзельнікі павінны даць інфармацыю пра сваю малую радзіму. Гэта можа быць гісторыя аб горадзе, раёне, вёсцы, вуліцы і г.д. (матэрыялы могуць быць пацверджаны фатаграфіямі з кароткім каментарыем. Фатаграфіі прыкладаюцца ў лічбавым фармаце. Фармат фатаграфіі –JPEG. Тэкст дасылаецца у фармаце doc (docx) на электронную пошту market@publib.by